Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

1 ЛІПЕНЯ 2020 г. СЕРАДА № 126 (29240)

ПАГУЛЯЦЬ У ЛЕСЕ І... НЕ ЗГУБІЦЦА 5

ЯК ПАЗБЕГНУЦЬ КАРЫЕСУ 8

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар СЕРГЕЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Пандэмія даказала здольнасць беларускай сістэмы аховы здароўя вытрымаць гэтыя ўдары, хоць і было напружанне. Яна паказала, як можа мабілізавацца прамысловасць, каб забяспечыць насельніцтва патрэбнымі сродкамі аховы. Мы павінны разумець, што з гэтым вірусам, напэўна, давядзецца жыць у бліжэйшы час. Цяжка прадказаць, што будзе далей. Але гэтая падзея навучыла многаму, праявіла многія чалавечыя якасці беларусаў розных прафесій, не толькі медыкаў. І з'яднала людзей».

«Гэта нашы агульныя перамога, памяць і слава»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка разам з расійскім калегам Уладзімірам Пуціным адкрылі мемарыял Савецкаму салдату пад Ржэвам

Падчас мерапрыемства кіраўнікі дзяржаў пагутарылі з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, усклалі кветкі да падножжа манумента. Пасля гэтага ўдзельнікі мерапрыемства ўшанавалі памяць загінулых хвілінай маўчання.

СТАР. 2

На шляху да «Сонейка»

Учора ў Петрыкаве, акурат у дату вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пасля маштабнага рамонту ўрачыста адкрыўся яслі-сад № 5 «Сонейка».
На фота: **Генадзь і Ірына ШЭВЕЛІ вядуць дачку Дарыну ў адноўлены садок.**

Фота БелТА.

КОРАТКА

- **БРСМ запрашае жыхароў і гасцей Мінска 2 ліпеня на «Дзень вышыванкі».**



- Знешні дзяржаўны доўг Беларусі ў студзені–маі знізіўся на 2 % да $16,8 млрд.
- **АПБ просіць паведамляць аб месцах пражывання дзікіх хамякоў ў Беларусі.**

- Гродзенскія бацькі змогуць паглядзець анлайн-трансляцыі з аздараўленчых лагераў.
- **Белкаапсаюз разлічвае да канца года адкрыць інтэрнэт-крамы ва ўсіх раёнах краіны.**
- Дэфіцыт рэспубліканскага бюджэту ў студзені–маі склаў Br0,07 млрд.
- **У Літве ўведзена патрабаванне абавязковай самаізаляцыі для тых, хто прыбывае з 50 краін.**

ЗАКОНЫ ПАВІННЫ АДПАВЯДАЦЬ ІНТАРЭСАМ ГРАМАДСТВА

Выступленне старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Н. І. Качанавай на закрыцці другой сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!
Паважаныя запрошаныя!

Завяршае работу другая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання.

Перш за ўсё хацелася б спыніцца на выніках нашай дзейнасці за мінулы перыяд. Гэта заканадаўчае забеспячэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця, арганізацыі рэгіянальнай палітыкі, работа са зваротамі грамадзян, удзел у правядзенні мерапрыемстваў па эпідэміялагічнай бяспецы і ахове жыцця і здароўя насельніцтва.

СТАР. 3

ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ВЫКЛІКІ ЧАСУ НА КАРЫСЦЬ КРАІНЫ

Выступленне старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. П. Андрэйчанкі на закрыцці другой сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання

Паважаныя дэпутаты і запрошаныя!

Другая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання завяршае сваю работу.

Яна праходзіла на фоне сур'ёзных змен, якія закранаюць увесь свет. Супрацьстаянне дзяржаў, ускладненае наступствамі пандэміі і адсутнасцю канструктыўнага міжнароднага дыялогу, непазбежна адбілася і на сітуацыі ў нашай краіне. Спатрэбілася максімальная канцэнтрацыя намаганняў усіх органаў улады, у тым ліку парламента, па падтрыманні эканамічнай стабільнасці, ахове жыцця і здароўя нашых грамадзян.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X